*Венідзіктаў С.В.*
*Магілёўскі інстытут Міністэрства ўнутраных спраў*
*Рэст'блікі Беларусь, Магілёў*

**МЕДЫЯТЭХНАЛОГIIЎ ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ САЦЫЯЛЬНА-ГУМАШТАРIIЫХ ДЫСЦЫПЛШ (ВОПЫТ МАГIЛЁЎСКАГА ШСТЫТУТА МУС)**

У Магілёўскім інстытуце МУС шырокае выкарыстанне мэдыятэхналогій у працэсе выкладання сацыяльна-гуманітарных дысцыплін звязана з дзейнасцю комплексу «Лабараторыя навучальнага тэлебачання - Цэнтр медыякамунікацыі». Лабараторыя навучальнага тэлебачання функцыянуе з верасня 2012 г., з 2014 г. - у межах навуковага гуртку кафедры. Цэнтр медыякамунікацыі, які створаны ў 2014 г. па прынцыпе модульнай адукацыйнай npacTopbi$_s$ дазваляе арганізоўваць відэаканферэнцыі, вэб-семінары, прэс-канферэнцыі, а таксама круглыя сталы і семінары традыцыйнага фармату.

Адукацыйны кірунак дзейнасці комплексу прадугледжвае стварэнне навучальных фільмаў і іншых відаў аўдыёвізуальнага дыдактычнага забеспячэння, укараненне ў навучальны працэс відэаўрокаў, відэасюжэтаў для лекцыйнага матэрыялу і г. д. Праведзены намі аналіз паказаў, што болып за 50 % лекцыйных тым па дысцыплінах гуманітарнага цыклу маюць патрэбу ў дадатковай візуалізацыі. Напрыклад, навучальны фільм «Ва ўмовах камунікацыйнага супрацьдзеяння» (дысцыпліна «Рыторыка») адлюстроўвае спецыфіку маўленчай дзейнасці супрацоўнікаў органаў унутраных спраў.

Дыдактычная відэапрадукцыя, жая ствараецца ў лабараторыі. прызначана для выкарыстоўвання ў працэсе выкладання таксама профільных дысцыплін установы (напрыклад, фільм «Арганізацыя агляду паветранага судна» - дысцыпліна «Тактыка-спецыяльная падрыхтоўка», фільм «Выкананне стралковых практыкаванняў» - дысцыпліна «Агнявая падрыхтоўка», фільм «Дысмургія» - дысцыпліна «Медыцынская падрыхтоўка», фільм «Судовая прэс-канферэнцыя» - дысцыпліна «Крымінальны працэс» і інш.). Асаблівасцю дыдактычнага відэа, падрыхтаванага лабараторыяй, з'яўляецца яго модульная пабудова: часткі фільмаў могуць быць выкарыстаны ў якасці асобных завершаных сюжэтаў, відэазадач, інструкцый. Падобныя модулі мэтазгодна ўключаць у склад электронных вучэбна-метадычных комплексаў, а таксама выкарыстоўваць як ілюстрацыйны матэрыял падчас правядзення семінарскіх і практичных заняткаў, дыскусій, круглых сталоў.

У 2013-2014 гг. быў рэалізаваны праект «Нарад па-за чаргой» - цыкл праграм, якія раскрываюць спецыфіку працы розных органаў і падраздзяленняў Міністэрства ўнутраных спраў. Усе 20-хвілінныя серыі (аб дзейнасці ўчастковых інспектараў міліцыі ў горадзе і на вёсцы, транспартнай міліцыі, Дзяржаўтаінспекцыі, Дэпартамента аховы, АМАПу і г. д.) выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе ў якасці ілюстрацыйнага і праблемнага відэаматэрыялу (дысцыпліны «Юрыдычная псіхалогія», «Рыторыка», «Службовая культура і этыка», «Прафесійная псіхалогія», «Псіхалогія дэвіянтных паводзінаў» і інш.). Іх дыдактычная каштоўнасць абумоўлена напаўдакументальным характарам відэа, праўдападобнасцю і непрадказальнасцю сітуацый, у якія трапляюць вядучыя-курсанты.

У 2015 г. у межах заняткаў па дысцыпліне «Службовая культура» слухачоў аддзялення перападрыхтоўкі кадраў інстытута (катэгорыя «Арганізацыйна-прававое забеспячэнне бяспекі дарожнага руху») быў падрыхтаваны навучальны фільм для супрацоўнікаў ДАІ «Біць ці не быць? - Непадпарадкаванне». У фільме рэалізаваны сцэнар, распрацаваны на аснове аналізу відэазапісаў сітуацый непадпарадкавання і процідзеяння з боку правапарушальнікаў. Фільм уяўляе сабой пакрокавую відэаінструкцыю паводзінаў супрацоўнікаў ДАІ ў падобных абставінах. Праект вызначаецца відавочным практычным значэннем і не мае аналагаў у рэспубліцы ў якасці медыярэсурсу для правядзення заняткаў па службовай падрыхтоўцы супрацоўнікаў органаў унутраных спраў. Відэа было накіравана ва ўсе УУС Рэспублікі Беларусь і ў ГУУС Мінгарвыканкама для далейшага распаўсюджвання і выкарыстання.

Акрамя медыяпрадукцыі ўласнай вытворчасці, супрацоўнікамі кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін актыўна выкарыстоўваюцца іншыя аўдыёвізуальныя матэрыялы. Так, на занятках па замежнай мове яны служаць для ўдасканалення ўспрымання іншамоўнай прамовы на слых. У электронны вучэбна-метадычны комплекс па дысцыпліне «Замежная мова (англійская)» уключаны відэакурс англійскай мовы «Headway», якім карыстаюцца курсанты ў якасці дадатковага навучальнага матэрыялу. У вучэбна-метадычны комплекс па дысцыпліне «Замежная мова (нямецкая)» уключаны відэаматэрыялы па кожнай з праграмных лексічных тэм. Акрамя таге, у распараджэнні курсантаў ёсць іншыя навучальныя фільмы і спецыялізаваныя камп'ютэрныя праграмы, якія можна выкарыстоўваць для дадатковай працы падчас вывучэння замежных моў.

У працэсе выкладання інтэграванага модулю «Філасофія» 1 дысцыпліны «Філасофія правы», акрамя слайд-прэзентацый. выкарыстоўваюцца філасофскія мультфільмы, відэаэпіграфы да адпаведных тэм, а таксама відэафрагменты ў сярэдзіне заняткаў для псіхалагічнай разрадкі навучэнцаў. Па ўсіх тэмах дысцыпліны «Вялікая Айчынная вайна савецкага народу (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» падабраныя і дэманструюцца на семінарах фрагменты дакументальных фільмаў. Падчас выкладання дысцыплін «Рыторыка» і «Юрыдычная псіхалогія» выкарыстоўваюцца праблемныя відэазаданні, для вырашэння якіх курсантам прапануецца ствараць уласныя відэафільмы. Дысцыпліна «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» прадугледжвае дэманстрацыю фрагментаў відэафільмаў для пераказу фабулы злачынстваў і правапарушэнняў. што змяшчаюцца ў іх, на беларускай мове, а таксама прагляд беларускамоўных мастацкіх і дакументальных фільмаў.

Эфектыўнасць укаранення ў навучальны працэс дыдактычнай відэапрадукцыі абумоўлена як агульнымі заканамернасцямі ўспрымання і засваення інфармацыі (задзейнічаны адразу некалькі каналаў камунікацыі), так і адносна абстрактным характарам профільных дысцыплін ведамаснай установы, што ўскладняе ўспрыманне тэарэтычнага матэрыялу без візуальнай прапрацоўкі.

Падобная дзейнасць па медыятызацыя адукацыйнага асяроддзя ў інстытуце мае патрэбу ў тэарэтычным абагульненні. У 2014 г. на базе кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін была праведзена I Міжнародная завочная навуковая канферэнцыя «Медыясфера і медыяадукацыя: спецыфіка ўзаемадзеяння ў сучаснай сацыякультурнай прасторы», вынікам якой стала выданне зборніка

навуковых прац. Другая міжнародная канферэнцыя па аналагічнай праблематыцы, якая адбылася ў траўні 2015 г., цалкам прайшла ў анлайн-рэжыме (з выкарыстаннем сервісаў Skype і Conferendo). Канферэнцыя дала магчымасць у новым фармаце абмеркаваць такія актуальныя пытанні, як медыяадукацыя ва ўмовах фарміравання інфармацыйнага грамадства, развіццё медыякамунікатыўнай кампетэнтнасці ў акадэмічным асяроддзі, навукова-метадычнае і тэхналагічнае забеспячэнне інавацыйных працэсаў у адукацыі, а таксама выпрацаваць інфармацыйную стратэгію фарміравання станоўчага іміджу навучальнай установы. Да ўдзелу ў канферэнцыі заявіліся 76 даследчыкаў з Беларусі, Расіі (Калуга, Курск, Чалябінск, Масква, Растоў-на-Доне, Таганрог, Воронеж, Навасібірск, Санкт-Пецярбург, Барнаул), Казахстана (Астана, Караганда), Украіны (Кіеў, Запорожжа, Львоў, Чаркасы, Драгобыч, Луцк, Палтава, Херсон, Бярдзянск, Днепрапятроўск, Данецк). Такім чынам, цэнтр медыякамунікацыі кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін можа прэтэндаваць на ролю рэгіянальнай дыскусійнай пляцоўкі падчас правядзення семінараў, канферэнцый рознага ўзроўню, вэбінараў з удзелам спецыялістаў у галіне сучаснай медыясферы.

Мэдыятэхналогіі ў Магілёўскім інстытуце МУС дазволілі таксама пашырыць кола навучэнцаў, якія задзейнічаны ў навуковых праектах, Цэнтр медыякамунікацыі актыўна выкарыстоўваецца курсантамі навучальнай установы для ўдзелу ў сумесных анлайн-мерапрыемствах як праваой, так і сацыягуманітарнай накіраванасці. Найбольш актыўнае ўзаемадзеянне наладжана з Варонежскім інстытутам МУС Расіі, таксама развіваецца супрацоўніцтва з іншымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Расійскай Федэрацыі. Напрыклад, у студзені 2015 г. у цэнтры медыякамунікацыі ў анлайн-рэжыме адбыўся навуковы семінар «Асаблівасці сацыяльных працэсаў у Рэспубліцы Беларусь», у якім прынялі ўдзел даследчыкі з трох беларускіх універсітэтаў, а таксама расійскія вучоныя. Абмеркаванне агульных праблем і абмен вопытам пры гэтым не звязаны са значнымі фінансавымі і часавымі выдаткамі, непазбежнымі пры «традыцыйных» формах камунікацыі. Узаемадзеянне ў анлайн-рэжыме прадастаўляе магчымасць прыцягнення беларускіх курсантаў да ўзаемадзеяння з аднагодкамі з-за мяжы, а таксама распрацоўкі комплексу доўгатэрміновых праграм сумесных даследаванняў.

У якасці стратэгічнай задачы ўкаранення медыяадукацыйных сродкаў у практыку падрыхтоўкі супрацоўнікаў для органаў унутраных спраў праваерна разглядаць распрацоўку збалансаванага факультатыўнага курсу па медыяграматнасці. Падобны курс мог бы

з неабходнымі карэкціроўкамі ўкараняцца ў навучальны працэс устаноў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі рознай ведамаснай падпарадкаванасці. Таксама перспектыўным уяўляецца стварэнне на базе кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Магілёўскага інстытута МУС навукова-даследчай лабараторыі медыяадукацыі.